**Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц (1948 – 1988), паэтэса,**
**лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978)**
**і Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я.Купалы (1986)**



Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц нарадзілася 20 лістапада 1948 года ў вёсцы Рудка Пінскага раёна ў сялянскай сям'і.

Вучылася спачатку ў Рудкаўскай пачатковай школе, потым – у Мерчыцкай семігодке, а ў 1966 годзе 10 клас закончыла ў Парэцкай сярэдней школе.

12 студзеня 1963 года ў раённай газеце "Палеская праўда" быў надрукаваны першы верш "Голуб" Жэні Янішчыц, а 11 красавіка 1964 г. змешчаны тры яе вершы і фотаздымак. А ўжо праз год выпускніца Парэцкай школы Жэня Янішчыц перамагла ў рэспубліканскім конкурсе юных паэтаў, аб'яўленым беларускай радыёстанцыяй "Арляняты".

У 1966 годзе Яўгенія Янішчыц паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Актыўна ўдзельнічала ў літаратурным аб'яднанні "Узлёт".

У 1970 годзе, калі Я.Янішчыц вучылася на пятым курсе, убачыў свет яе першы зборнік "Снежныя грамніцы". Акрамя таго, Жэня актыўна друкавалася ў рэспубліканскай перыёдыцы. У 1971 годзе Я.Янішчыц прымаюць у Саюз пісьменнікаў Беларусі. Адзін за другім выходзяць кнігі паэзіі "Ясельда" (1978), "На беразе пляча" (1980), "Каліна зімы" (1987), "У шуме жытняга святла" (1988). За зборнік вершаў "Дзень вечаровы" ёй была прысуджана прэмія Ленінскага камсамола Беларусі (1978), а за кнігу лірыкі "Пара любові і жалю" – Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Купалы (1986).

Пасля заканчэння універсітэта Я.Янішчыц некаторы час працавала загадчыцай бібліятэкі ў ЦК ЛКСМБ (1971). У 1971-1974 гадах была на творчай працы. Выйшаўшы замуж за паэта Сяргея Панізніка, тады вяскоўца, некалькі месяцаў загадвала бібліятэкай адной з воінскай часцей БВА, жыла ў Чэхаславакіі. У 1974-1976 гадах – зноў на творчай працы. З 1976 года – літкансультант "Сельскай газеты". У 1983 – 1988 гг. загадвала аддзелам паэзіі часопіса "Маладосць".

Абіралася дэпутатам раённага Савета Савецкага раёна г.Мінска, членам праўлення і прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1981 годзе Я.Янішчыц у якасці члена дэлегацыі БССР прымала ўдзел у рабоце чарговай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН.

У 1988 г. трагічна завяршылася жыццё "палескай ластаўкі". У гэтым жа годдзе выйшла кніга выбранага "У шуме жытняга святла", дзе сабрана лепшае з напісанага за дваццаць гадоў літаратурнай працы.

Паэзія Я.Янішчыц перакладалася на многія мовы свету: англійскую, балгарскую, іспанскую, нямецкую, польскую, рускую, украінскую мовы. У 1985 годзе выйшла яе кніга вершаў у перакладзе на рускую мову Рымай

Казаковай “Спроси у чебреца”. Звярталася Я.Янішчыц і да прозы, напісала некалькі апавяданняў, у якіх выведзены яскравыя народныя тыпы. Выступала ў друку з артыкуламі, рэцэнзіямі. Творы Яўгеніі Іосіфаўны Янішчыц прыходзяць да чытача (ужо ў выглядзе паэтычнай спадчыны) і ў пазнейшы час. У 2000 годзе выйшла кніга “Выбранае”, дзе ўкладальнікамі А.Канапелькай і В. Коўтун адабрана ўсё найбольш істотнае з творчага даробку паэтэсы. На словы паэтэсы кампазітары Р.Давыдаў, Ю.Семяняка, М.Юрко і іншыя напісалі песні.

На Піншчыне шануюць памяць зямлячкі. Пасля смерці паэтэсы настаўніца Парэцкай школы Антаніна Паўлаўна Сідарук разам з Фёдарам Фёдаравіча Цудзілам пачалі работу па ўшанаванню памяці Яўгеніі Янішчыц. 21 лістапада 1998 года да 50-гадовага юбілею паэтэсы ў Парэцкай школе адкрылі літаратурны музей Я.Янішчыц. Сёння ў ім захоўваецца каля 2 тысяч экспанатаў. Кніга водгукаў запаўняецца запісамі наведвальнікаў не толькі з Беларусі, але і Расіі, Украіны, Польшчы, Італіі, Германіі і ншых краін.

У 2008 годзе Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт прысвоіў імя Яўгеніі Янішчыц установе адукацыі “Парэцкая дзяржаўная базавая агульнаадукацыйная школа Пінская раёна”. У в. Парэчча есць вуліца, якая носіць імя Я.Янішчыц. На доме, дзе нарадзілася беларуская паэтэса Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц, ў 1998 годзе ўстановлена мемарыяльная дошка. З мэтай ушанавання памяці “палескай кнігаўкі” 13 мая 1998 года яе імя была прысвоена раённай цэнтральнай бібліятэцы, а ў горадзе Пінску адной з вуліц ў новым мікрараёне дадзена імя знакамітай паэткі.

Кожны год да дня нараджэння Я.Янішчыц ва ўстановах культуры афармляюцца кніжныя выставы, праводзяцца шэраг разнастайных мерапрыемстваў, сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі, у школах – літаратурны часы, прысвечаныя творчасці Я.Янішчыц.

2013 год у бібліятэках Пінскага раёна аб’яўлены Літаратурным годам Яўгеніі Янішчыц. У аддзеле бібліятэчнага маркетынга распрацавана тэматычная праграма “Паэтычная спадчына Я. Янішчыц”. У бібліятэках РЦБС дадзены старт раённай акцыі “Кнігі Я. Янішчыцчакаюць вас!” З мэтай ўмацавання ролі бібліятэк, як цэнтраў краязнаўчай інфармацыі папулярызацыі творчай спадчыны Я. Янішчыц, у лютым месяцы ў чытальным зале ЦРБ імя Я. Янішчыц прайшоў раённы конкурс чытальнікаў вершаў “І плыве твой радок. І звініць тваё слова”.

Жыццё і творчасць Яўгеніі Янішчыц пакінулі шмат загадак, якія немагчыма, ды і не патрэбна разгадваць. Як немагчыма хоць на момант прыпыніць палёт гэтай непрыручанай птушкі беларускай паэзіі.

***Паэтычныя творы паэткі:***

1. **Янішчыц, Я.** Снежныя грамніцы / Я.Янішчыц.  Мінск: Беларусь, 1970.
2. **Янішчыц, Я.** Дзень вечаровы: лірыка / Я.Янішчыц. Мінск: Маст. літ., 1974. 78 с.
3. **Янішчыц, Я.** Ясельда: лірыка / Я.Янішчыц. Мінск: Маст. літ., 1978. 128 с.: іл.
4. **Янішчыц, Я.** Пара любові і жалю: кніга лірыкі / Я.Янішчыц. Мінск: Выш. шк., 1983. 223 с.
5. **Янішчыц, Я.** На беразе пляча: лірыка / Я.Янішчыц. Мінск: Маст. літ., 1980. 96 с.
6. **Янішчыц, Я.** Каліна зімы: кніга лірыкі / Я.Янішчыц. Мінск: Маст. літ., 1987.  206 с.: іл.
7. **Янішчыц, Я.** У шуме жытняга святла: вершы, паэмы / Я.Янішчыц. Мінск: Маст. літ., 1988. 414 с.
8. **Янішчыц, Я.** Выбранае / Яўгенія Янішчыц. Мінск: Маст. літ., 2000. 351 с. : іл.
9. **Янішчыц, Я.** Выбранае / Яўгенія Янішчыц. Мінск: Выш. школа, 1998. 271 с., 1 л. партр.: іл.  (Школьная бібліятэка).
10. **Янішчыц, Я.** Пачынаеццца ўсё з любві…: вершы, паэмы / Яўгенія Янішчыц. Мінск: Маст. літ., 2008. 339 с. (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

***Аб жыцці і творчасці паэтэсы:***

1. **Последний** полет ласточки Полесья. Евгения Янищиц // Рублевская Л. И. Рифма ценою в жизнь : эссе по истории белоруской литературы / Людмила Рублевская. Минск, 2013. С. 265-267.  (Беларусь : вчера и сегодня).
2. **Катляроў, І.** Жыцця загадкавы палет : да 65-годзя Яўгеніі Янішчыц / Ізяслаў Катляроў // Государственный контроль. 2013. №3(9). С. 95-96
3. **Даніловіч, Т.** Чароўная кветка беларускай паэзіі : [вечарына ў літаратурна-музычнай гасцёўні цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Я. Янішчыц] / Таццяна Даніловіч // Полес. правда. 2012. 24 ноября.
4. **Васілеўскі, М.** Мы родам з “Лунінскай восені” : [на Лунінеччыне адбыліся паэтычныя чытанні, прысвечаныя творчасці Я. Янішчыц] / Мікалай Васілеўскі // Полес. правда. 2008. 13 декабря.
5. **Аўсяннікава, Т.** След на зямлі : [музей Я.Янішчыц] / Тамара Аўсяннікава // Полес. правда.  2012.  27 октября.
6. **Аўсяннікава, Т.** Абнадзееныя дні : [творчасць Я.Янішчыц] / Тамара Аўсяннікава // Маладосць. 2011.  №3.  С. 133-136
7. **Яўгенія** Янішчыц : “Любоў мая, ты песня, і маркота…” // Мяснікоў А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі : гістарычныя партрэты / Анатоль Мяснікоў. Мінск, 2008. С. 328-331
8. **Янішчыц** Яўгенія // Літаратурная карта Берасцэйшчыны / укл. А. Крэйдзіч. Брэст, 2008. С. 471-474
9. **Вайцяхоўская, Т.** Мовай любові і натхнення : Фестываль паэзіі “Лунінская восень-2008” выдатнай беларускай паэтэсе Яўгеніі Янішчыц прысвячаецца / Таццяна Вайцяхоўская // Народная трыбуна. 2008. №51 (20 снежня).

10. **Крывапуст, В.** Тут яе голас / Вікторыя Крывапуст // Полес. правда. 2008. 6 декабря.
11. **Шестакова, Н.** “Каб застацца ў нязменнай любові – табе!”: Под звездой Евгении Янищиц / Наталья Шестакова // Полес. правда. 2008. 26 ноября.
12. **Ільянкоў, В.** “Вечная прага крыла – вера і сіла палёту” : [святочныя літаратурныя мерапрыемствы да 60-й гадавіны з дня нараджэння Я. Янішчыц] / Вячаслаў Ільянкоў // Пінскі веснік. 2008. 25 лістапада.
13. **Яўгенія** Янішчыц : “Завязь лета з гарчынкай шчасця на губах : [творчая сустрэча літаратараў пра ролю Я. Янішчыц у літаратуры, пра яе трачічны лёс, пра яе Палессе…] // Народная газета. 2008. 21 лістапада.
14. **Шестакова, Н.** …И здесь крылья обрела : [Поречской базовой школе присвоено имя Е. Янищиц] / Наталья Шестакова // Полес. правда. 2008. 19 ноября.
15. **Скороход, Ю.** Живём и помним : круглый стол с председателями Мерчицкого, Поречского сельисполкомов Анной Ивановной Пискун и Михаилом Андреевичем Вирковским / Юрий Скороход // Полес. правда. 2008. 19 ноября.
16. **Школа** имени поэтессы : Базовая общеобразовательная школа в д. Поречье названа именем белорусской поэтессы Евгении Янищиц // Заря. 2008. 18 ноября.
17. **Васілеўскі, М.** Свята, якое выпраменьвае святло: пад зоркай Я. Янішчыц [падрыхтоўка да святкавання юбілею Я. Янішчыц] / Мікалай Васілеўскі // Полес. правда. 2008. 22 октября.
18. **Гришковец, В.** К юбилею Евгении Янищиц : [состоялось расширенное заседание оргкомитета по проведению 60-летнего юбилея поэтессы] / Валерий Гришковец // Заря. 2008. 18 октября.
19. **Ребковец, В.** Под звездой Янищиц : 2008 год объявлен на Пинщине годом Е.Янищиц / Валерий Ребковец // Нёман. 2008. №10. С. 75-79.
20. **Мартинович, А.** “…Жыць мне тут заўсёды” : к 60-летию со дня рождения Евгении Янищиц / Алесь Мартинович // Нёман. 2008. №10. С. 175-181
21. **Федорович, В.** Памяти Евгении Янищиц / Валерий Федорович // Пін. весн. 2008. 22 жніўня.
22. **Геньчык, Ю.** Пад зоркай Яўгеніі Янішчыц / Юрась Геньчык // Літаратура і Мастацтва. 2008. 15 жніўня.
23. **Гук, У.** Пакланіцеся памяці Жэні Янішчыц : Да 60-годдзя з дня нараджэння паэтэсы / Уладзімір Гук // Пін. весн. 2008. 8 жніўня.
24. **60-годдзю** з дня нараджэння паэтэсы Яўгеніі Янішчыц прысвячаецца…/ адказны за выпуск І. М. Багатка, склад. В.М.Клёша. Пінск : КУП “Пінская рэгіянальная друкарня”, 2008. 25 с. : іл.
25. **Калядка, С. У.** Непрыручаная птушка Палесся : творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц / С. У. Калядка. Мінск : Бел. навука, 2007. 216 с.
26. **Міранчык, М.** На левым беразе Прыпяці : Геній Яўгеніі / Мікола Міронччык // Літаратура і Мастацтва. 2006. 10 лістапада.
27. **Лягун, А.** Родных крыніц прыцягненне : Беражліва захоўваюць памяць паэтэсы Яўгеніі Янішчыц яе землякі / Алена Лягун // Заря. 2005. 3 сент.
28. **Янищиц** Евгения // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах / авт.-сост. И. А. Кибак. Минск, 2004. С. 19

29. **Гарэлік, Л. М.** Янішчыц Яўгенія Іосіфаўна / Л. М. Гарэлік // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / редкал. : Г.П.Пашкоў і інш. Мінск, 2004. Т. 18. кн.1. С. 271
30. **Кірыковіч, А. С.** Янішчыц Яўгенія Іосіфаўна. Ясяльдзяначка / А. С. Кірыковіч // Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. С.492-495, 456, 567
31. **Літаратурны** музей Я. Янішчыц у в. Парэчча // Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. С.557
32. **Гарэлік, Л. М.** Янішчыц Яўгенія / Л.М.Гарэлік // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. Слоўнік : у 6 т. Мінск, 1995. Т.6. С. 492-497
33. **Я.Янішчыц** // Паэтычныя галасы Брэстчыны : Бібліягр. паказальнік у дапамогу настаўніку бел. мовы і літ. пры вывучэнні сучаснай паэзіі і для пазакласнай работы па літ-ры. Брэст, 1991. С. 31-35
34. **О присвоении** имени Е.И.Янищиц Пинской центральной районной библиотеке : постановление Совета Министров Республики Беларусь от 13 мая 1998 г. № 743 // Собрание декретов, указов Президента и постановлений Правительства Республики Беларусь. 1998. № 14. ст. 372, 5/17755
35. **Об увековечении памяти Е.И.Янищиц** : постановление Совета Министров Белорусской ССР от 6 сентября 1990 г. № 222 // Банк данных “Законодательство Республики Беларусь”, 5/23020
36. **Біяграфія** Яўгеніі Янішчыц : Жыццяпіс // http://www.yaugeniya.ru/biyagrafiya-yaugenii-yanishchy
37. **Беларуская** паэзія : Яўгенія Янішчыц // http://allpoet.ru/bel/author/242/0/index.
38. **Евгения** Янищиц и Василий Коротышевский//http://brama.brestregion//http://brama.brestregion.com/nomer25 / artic19.shtml
39. **Яўгенія** Янішчыц. Аналіз творчасці //http://www.vodguki.ru/yaugeniya-yanishchyts-analiz-t
40. **Евгения** Янищиц //http://ru.wikipedia.org/wiki/
41. **Улица** Е.Янищиц //http://map.by/streets/
42. Янішчыц, Я. І. Кахання сад і ластаўка вясны : [вершы] / Яўгенія Янішчыц ; [укладанне В. Шніпа ; мастак М. Казакевіч]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. – 109, [1] с. – (100 вершаў).